патокі прадстаўлены, як правіла, нешматлікімі дакументамі (ад 1 да 20).

Найболып актыўна распрацоўвалася гісторыя уніяцтва на Беларусі, праваслаўных і каталіцкіх культавых збудаванняў.

Для разглядаемага ДП, як і ДП па гісторыі і гістарычных навуках Беларусі наогул, характэрна ўскладненне тэматычнай структуры ў 90-х гадах, узбуйненне асобных патокаў падчас угодкаў значных падзей рэлігійнага жыцця Беларусі. Напрыклад, 400-годдзе Брэсцкай уніі спрыяла шырокаму абмеркаванню гэтай падзеі ў друку, і ёй быў прысвечаны шэраг адпаведных дакументаў (у 1996 г. – каля 20).

Нягледзячы на значнае павелічэнне агульнага аб'ёму ДП гісторыка-рэлігійнай тэматыкі ў сярэдзіне 90-х гадоў, большасць названых тэматычных накірункаў прадстаўлены невялікай колькасцю дакументаў (у асноўным артыкуламі з часопісаў і газет) і патрабуюць далейшай распрацоўкі (у прыватнасці, гісторыя асобных канфесій на Беларусі, гісторыя культавых збудаванняў; развіццё рэлігійнай думкі ў розныя перыяды). Акрамя таго, у аналізуемым ДП адсутнічаюць абагульняючыя працы па гісторыі рэлігійнай думкі на Беларусі і ў асобных яе рэгіёнах.

**А.Я. Ляскоў**, аспірант
Беларускага дзяржаўнага універсітэта

## СТАНОВІШЧА ХРЫСЦІЯНСКІХ КАНФЕСІЙ У РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XVIII ст.)

Падставай для ўмяшання імперскіх дзяржаў ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай стала пытанне канфесійных узаемадачыненняў у каралеўстве. Вядома, што каталіцкая царква праводзіла нецярпімую палітыку супраць іншаверцаў, большасць якіх складалі праваслаўныя і пратэстанты. У Рэчы Паспалітай былі прыняты дыскрымінацыйныя прававыя акты. Іншаверцы, якіх зняважліва называлі "дысідэнтамі", адкрыта праследаваліся. Найболып зацікаўленай у вырашэнні дысідэнцкага пытання была Расія, бо большасць іншаверцаў у Рэчы Паспалітай складалі праваслаўныя беларусы і ўкраінцы. Прусія падтрымлівала правы рэлігійных меншасцей у каралеўстве толькі фармальна і таксама праводзіла пракаталіцкую палітыку. Пацвярджэннем таму можа служыць ліст Фрыдрыха II да прускага пасла Бенуа, у якім ён пісаў: "Па сутнасці я не буду расчараваны, калі дысідэнцкая справа не ўдасца. Вы гэтага не выяўляйце перад рускімі, рабіце выгляд, быццам я вельмі разгневаны, што ўсе намаганні, прыкладзеныя для



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

поспеху гэтай справы, былі змарнаваныя. Было б добра і выгадна, калі б вы прымусілі вядомых людзей працаваць супраць дысідэнцкай справы, калі толькі магчыма гэта рабіць таемна, каб ніхто не мог даведацца, адкуль гэта ідзе".

Двудушная палітыка прускага караля спрыяла ўзмацненню пазіцый каталіцкіх рэакцыянераў, якія выступілі супраць ідэі надання аднолькавых правоў усім хрысціянскім канфесіям у Рэчы Паспалітай. Каталіцкае духавенства і магнаты змагаліся за адмену любых рэформаў дзяржаўнага ладу ў супольнай дзяржаве Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. Яны патрабавалі шырокага прымянення liberum veto па ўсіх пытаннях. Сойм 1766 г. пацвердзіў непахіснасць liberum veto па ўсіх важнейшых праблемах грамадскага жыцця. Дысідэнцкае пытанне таксама засталося без вырашэння. Вынікам гэтых рашэнняў сойму стала рэзкая пазіцыя Расіі, якая выявілася ва ультыматыўных патрабаваннях да Чартарыскіх неадкладна спыніць дыскрымінацыю дысідэнтаў у Рэчы Паспалітай. Расія дзейнічала праз свайго пасла Рапніна, пры падтрымцы якога былі ўтвораны варожыя да Чартарыскіх канфедэрацыі. У сакавіку 1767 г. у Торуні сабраліся прадстаўнікі пратэстантаў. Адначасова ў Слуцку, у Беларусі, узнікла канфедэрацыя праваслаўных. Вядома, што Слуцк быў адным з цэнтраў праваслаўя ў Вялікім княстве Літоўскім, таму яго не дарэмна абралі для правядзення канфедэрацыі. У адказ на актыўныя дзеянні дысідэнтаў каталікі сабралі сваю канфедэрацыю ў Радаме. Яе ўзначаліў прадстаўнік найбольш заможнага і знакамітага магнацкага роду ў Беларусі, былы Вялікі гетман літоўскі Караль Радзівіл, вядомы ў гістарычнай літаратуры яшчэ і як "пане Каханку". Трэба адзначыць, што Караль Радзівіл заняў узважаную пазіцыю. Аб гэтым сведчыць прыняты маніфест Радамскай канфедэрацыі, у якім гаварылася, што канфедэрацыя не супрацьпастаўляе сябе каралю Рэчы Паспалітай, што яна звяртаецца да рускай імператрыцы з просьбай забяспечыць выкананне рашэнняў канфедэрацыі, што канфедэраты прапануюць дысідэнтам супольна абмяркоўваць спрэчныя пытанні.

Нават гэтыя памяркоўныя прапановы Радамскай канфедэрацыі не задавальнялі найбольш кансерватыўную групу духавенства, магнатаў і шляхты. З гэтай групы ў далейшым вылучыліся кіраўнікі Барскай канфедэрацыі. Рэакцыйна настроеныя каталіцкія епіскапы Солтык, Красінскі выступалі супраць вырашэння дысідэнцкага пытання і шукалі падтрымку ў Аўстрыі і нават Турцыі.

Важнай падзеяй для рашэння складанай міжканфесійнай сітуацыі ў Рэчы Паспалітай стала адкрыццё работы сойму ў кастрычніку 1767 г. На гэты раз пракаталіцкая групоўка пацярпела



РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

паражэнне. Немалаважнай тут была роля расійскага пасла Рапніна, які пры падтрымцы канфедэрацкай большасці арыштаваў найбольш актыўных працўнікаў вырашэння дысідэнцкага пытання: гетмана Вацлава Жэвускага і яго сына Севярына, а таксама біскупаў Солтыка і Залускага. Расія ўжо не хавала свайго адкрытага ўмяшання ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай. На сойме была створана дэлегацыя ў складзе 68 чалавек, якой даручалася весці перамовы з расійскім паслом. Вынікам кампрамісаў стаў дагавор 1768 г., паводле якога дысідэнты набывалі роўныя правы з каталікамі, было дазволена заключаць шлюбы паміж дысідэнтамі і каталікамі. У той жа час трэба адзначыць, што каталіцкае веравызнанне захоўвала дамінуючае становішча ў Рэчы Паспалітай. Каралём па-ранейшаму мог стаць толькі каталік. Важнае значэнне для перспектыў далейшага сацыяльна-палітычнага развіцця дзяржавы меў асобны акт, у якім пералічваліся Кардынальныя правы Рэчы Паспалітай. У гэтым акце абвяшчаліся вольная элекцыя і захаванне liberum veto, шляхецкіх прывілеяў і выключнага права шляхты займаць дзяржаўныя пасады. Таксама пацвярджаўся прынцып асабістай недатыкальнасці шляхціца. Выкананне Кардынальных правоў гарантавалася Расіяй.

Кардынальныя правы былі накіраваныя на знішчэнне рэформаў у Рэчы Паспалітай, распачатых соймам 1764 г. Варшаўскі дагавор 1768 г. сведчыў аб неабмежаваным уплыве Расіі на стан рэчаў у супольнай дзяржаве Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. Да таго ж рэакцыйная шляхта Рэчы Паспалітай дамагалася ліквідацыі ненавісных рэформаў дзяржаўнага ладу. Адзінае новае палажэнне Кардынальных правоў заключалася ў тым, што шляхта пазбаўлялася права смяротнай страты прыгонных сялян.

Нецярпімасць і фанатызм каталіцкага духавенства і магнатаў праявіўся і ў тым, што ў лютым 1768 г. у Бары, на Украіне, утварылася канфедэрацыя, якая заклікала змагацца за аднаўленне выключных правоў каталіцкай царквы і скасаванне раўнапраўя дысідэнтаў. У Бары нават паўстаў "Ордэн кавалераў святога крыжа", праграма якога была прасякнута рэлігійным фанатызмам.

Супраць канфедэратаў змагаліся супольна войскі Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Атрады, на чале якіх стаялі К.Браніцкі і Ю.Стэмпкоўскі, нанеслі канфедэратам паражэнне, і тыя вымушаныя былі адступіць да граніц з Турцыяй. Правадыры канфедэрацыі Красінскі, Патоцкі і Пуласкі схаваліся на тэрыторыі Малдавіі.

Аднак дзейнасць барскіх канфедэратаў працягвалася. У чэрвені 1768 г. у іх рукі перайшоў Кракаў. Канфедэраты трымалі абарону

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кракава на працягу месяца, пасля чаго ён быў узяты расійскімі войскамі Апраксіна.

Ацэньваючы праграму барскай канфедэрацыі, трэба адзначыць, што яна не толькі мела пракаталіцкі характар, але і была скіравана супраць рэформаў дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ